
З катэхізіса (1)

Аўтар: Рэдакцыя
24.11.2011 01:00



522. Прыход Божага Сына на зямлю з’яўляецца настолькі вялікай падзеяй, што Бог захацеў рыхтаваць яе на працягу стагоддзяў. Усе абрады і ахвяры, фігуры і сімвалы Першага Запавету Бог накіраваў да Хрыста; Ён прадказвае Яго праз вусны прарокаў, якіх па чарзе пасылае ў Ізраіль. Ён таксама абуджае ў сэрцах язычнікаў няпэўнае чаканне гэтага прыходу.

524. Цэлебруючы кожны год літургію Адвэнту, Касцёл актуалізуе гэтае чаканне Месіі; прымаючы ўдзел у доўгай падрыхтоўцы першага прыходу Збавіцеля, вернікі аднаўляюць гарачае жаданне Яго другога прыходу. Праз цэлебрацыю нараджэння і пакуты Папярэдніка Касцёл яднаецца з Яго жаданнем: “Ён мае расці, а я – змяншацца” (Ян 3, 30).